View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE

МИНИСТЕРСТВО ЗДРАВООХРАНЕНИЯ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

УО «ВИТЕБСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ
ОРДЕНА ДРУЖБЫ НАРОДОВ МЕДИЦИНСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ»

# ДОСТИЖЕНИЯ ФУНДАМЕНТАЛЬНОЙ, КЛИНИЧЕСКОЙ МЕДИЦИНЫ И ФАРМАЦИИ

Материалы 70-ой научной сессии сотрудников университета

28-29 января 2015 года

ВИТЕБСК - 2015 г.

**УДК 616+615.1+378**
**ББК 5Я431+52.82я431**
**Д 70**

**Редактор:**
Профессор, доктор медицинских наук В.П. Дейкало
**Заместитель редактора**:
доцент, кандидат медицинских наук С.А. Сушков

**Редакционный совет:**
Профессор В.Я. Бекиш, профессор Г.Н. Бузук, профессор С.Н. Занько, профессор В.И. Козловский, профессор Н.Ю. Коневалова, д.п.н. З.С. Кунцевич, д.м.н. Л.М. Немцов, профессор В.П. Подпалов, профессор М.Г. Сачек, профессор В.М. Семенов, доцент Ю.В. Алексеенко, доцент С.А. Кабанова, доцент Л.Е. Криштопов, доцент С.П. Кулик, доцент Т.Л. Оленская, профессор А.Н. Щапакова, д.м.н. А.В. Фомин.

ISBN 978-985-466-695-2

Представленные в рецензируемом сборнике материалы посвящены проблемам биологии, медицины, фармации, организации здравоохранения, а также вопросам социально-гуманитарных наук, физической культуры и высшей школы. Включены статьи ведущих и молодых ученых ВГМУ и специалистов практического здравоохранения.

**УДК 616+615.1+378**
**ББК 5Я431+52.82я431**

ISBN 978-985-466-695-2

© УО “Витебский государственный медицинский университет”, 2015

## НЕКАТОРЫЯ АСАБЛІВАСЦІ КУЛЬТУРНАГА ЖЫЦЦЯ ЛАТЫШСКАГА ЭТНАСУ Ў БЕЛАРУСІ (20-30-я ГАДЫ XX ст.)


**Балтрушэвіч Н.Г.**

*УО «Віцебскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»*


На тэрыторыі Беларусі нацыянальныя меншасці разам з беларусамі прайшлі адзіны, шмат у чым цярністы шлях, маюць нямала агульных нацыянальных герояў, пісьменнікаў, кампазітараў, грамадска-палітычных і дзяржаўных дзеячаў і г.д. Нацыянальныя меншасці на тэрыторыі Беларусі складалі істотную частку беларускага народа, зведалі працэсы асіміляцыі і інтэрнацыяналізацыі, але захавалі сваю самабытнасць.

Важнае значэнне ў гісторыі і культуры Беларусі адыграла латышская нацыянальная меншасць. Латышы (саманазва latviesi), народ балцкай моўнай групы, маюць даўнія этнакультурныя традыцыі на Беларусі. У XIII ст. жыхары Полацкай зямлі разам з латгаламі і іншымі балцкімі плямёнамі змагаліся супраць нямецкіх рыцараў. Перасяленне латышоў на ўсход і паўночны ўсход беларускіх зямель пачалося ў канцы XVIII ст., найбольш інтэнсіўна ішло ў 1860-1880 гг. У Віцебскай губерніі ўтвараліся цэлыя вёскі, хутары ці невялікія пасёлкі. Па перапісу 1989 г. на Беларусі пражывала 2658 латышоў. У час Першай сусветнай вайны колькасць латышоў павялічылася і складала больш за 20 тыс. чалавек, у 1920-1930-я гг. зменшылася да 14 тыс. чал. У 1920-1930-я гг. існавалі нацыянальныя латышскія сельсаветы: 2-гі Грудзінаўскі Быхаўскага, Унаўскі Лёзненскага, Перакальскі Глускага, Галіцкамызскі Клімавіцкага, Вацлаваўскі Ушацкага раёнаў [1, с. 338].

Адной з прыкметных рыс культурнай спадчыны беларускіх латышоў з’яўлялася іх адносна ранняе імкненне да адукацыі і ведаў. У першай палове XIX ст. значную ролю ў выхаванні і навучанні латышскіх дзяцей мела хатняе, або сямейнае навучанне. Пачынаючы з 1831 па гарадах, а з 1862 г. па мястэчках і сёлах, сталі адкрывацца народныя вучылішчы, што стала пачаткам народнай адукацыі. Аднак ахоп навучання сялянскіх дзяцей заставаўся невысокім. У 1911 г. у Латгаліі ён складаў 22,9 %. Але ж гэта было значна больш, чым па Віцебскай губерні ў цэлым. Таму і адукацыйны ўзровень латышоў у Віцебскай губерні быў вышэйшы за сярэднія губернскія паказчыкі [2, с. 32-33].

Увядзенне ўсеагульнага навучання дзяцей у 1920-я гг. і вызначэнне ў якасці першачарговай задачы ліквідацыю непісьменнасці з’явілася рэальным крокам Савецкай улады ў адказ на патрабаванне часу. Асабліва важным з’яўлялася тое, што на гэтым шляху ва ўмовах шматнацыянальнасці дзяржавы ў большасці яе рэспублік і рэгіёнаў было знойдзена адзіна правільнае рашэнне гэтай праблемы – навучанне дзяцей у школе на іх нацыянальнай мове. Побач з іншымі нацыянальнымі меншасцямі ў Беларусі і Заходняй вобласці магчымасць вучыць школьнікаў на нацыянальнай мове атрымалі і латышы [2, с. 32-33].

У месцах кампактнага пражывання латышоў існавалі латышскія школы: 14 у 1924 г., 21 у 1929 г., 24 у 1931-1932 гг., 22 у 1934-1935 гг., 12 у 1936 г. Існавалі і мяшаныя школы: 1 літоўска-латышская і 2 беларуска-латышскія ў 1936 г. Некаторыя газеты, як, напрыклад, лёзненскі “Ленінскі сцяг” у 1932 г., друкавалі і асобныя матэрыялы на латышскай мове [1, с. 338].

У 1920-я гг. шмат увагі надавалася задавальненню культурных патрэб розных нацменшасцей. І хаця найбольш важнай палітычнай задачай па-ранейшаму заставалася беларусізацыя, кіруючыя колы рэспублікі актыўна падтрымлівалі запатрабаванні іншых народаў.

Матэрыялы прафсаюзнай камісіі па ажыццяўленні нацыянальнай работы, справаздачы пра дзейнасць Латышскага бюро ЦК КП(б)Б, рэзалюцыі I Усебеларускага з’езда сялян-латышоў (1924) даюць цікавую і аб’ектыўную карціну культурнага будаўніцтва ў латышскіх пасяленнях. У 1926 г. існавала 17 латышскіх школ, якія абслугоўвалі 35% дзяцей латышоў школьнага ўзросту; астатнія наведвалі беларускія школы. У 1926/27 навучальным годзе латышскімі школамі было ахоплена 675 дзяцей. Ва ўсіх працоўных школах навучалася 940 вучняў-латышоў. Вельмі напружанае становішча было з падручнікамі, таму што сваёй выдавецкай базы не існавала. Іх друкавалі ў Маскве, куплялі за мяжой. Сямігадовая латышская школа тады знаходзілася ў Віцебску, 16 школ былі чатырохгадовыя [3, с. 8-9].

Народным камісарыятам асветы Беларусі праводзілася работа па ліквідацыі непісьменнасці і ўліку пісьменнага насельніцтва па нацыянальнасцях. Звесткі перапісу насельніцтва 1926 г. даюць цікавую карціну пісьменнасці насельніцтва Беларусі: беларусы – 36%, яўрэі – 70, рускія – 49, палякі – 50, украінцы – 43, латышы – 74, літоўцы – 61% [3, с. 9].

Як відаць з дакументаў, латышы ў Беларусі былі самым пісьменным насельніцтвам. Безумоўна, што высокі ўзровень адукацыі, культуры латышскіх гаспадароў абумовілі неадназначныя адносіны да іх з боку новай улады. Самым яскравым доказам таму служыць справаздача аб рабоце латбюро ЦК КП(б)Б за 1926 г. Вось вытрымка са справаздачы: “Латнасельніцтва ў Беларусі не карэннае. З’явілася галоўным чынам у 60-90-я гады мінулага стагоддзя. Большасць з іх – памешчыцкія батракі нямецкіх паноў”. “Настрой (латышскіх сялян) характарызуецца слабым удзелам у савецкім будаўніцтве, тактыкай чакання з прымессю незадавальнення” [3, с. 9-10].

У 1930 г. у латышскіх школах навучалася 77% дзяцей латышоў. Гэта самы высокі паказчык за ўсе гады. У наступным, 1931 г., было ахоплена нацыянальнай школай ужо 67% дзяцей [3, с. 11]. На патрабаванні латышоў выпісаць настаўнікаў з Рыгі савецкая ўлада ішла неахвотна, яна бачыла ў іх шпіёнаў, дыверсантаў і г.д. Таму галоўнымі цэнтрамі падрыхтоўкі настаўнікаў для пачатковых і сямігадовых школ заставаліся Масква і Ленінградскі педтэхнікум.

Шмат латышскіх настаўнікаў пацярпела ў гады масавых рэпрэсій. Так, дырэктар Унаўскай школы Лёзненскага раёна Вейс Георгій Іванавіч, ураджэнец вёскі Фізінкі Нараўлянскага раёна Гомельскай вобласці, член КПСС, па пастанове камісіі НКУС і Пракуратуры СССР ад 21.01.1938 г. быў прыгавораны да растрэлу. Рэабілітаваны ў 1957 г. [3, с.12].

Значнай праблемай для кіраўніцтва пададдзела і нацсекцый з'яўлялася надзвычай цяжкая сітуацыя з памяшканнямі для нацыянальных школ. "Становішча са школьнымі будынкамі для нацыянальных меншасцей катастрафічнае" – гэта характэрна для 1919 г, для 1920-х і 1930-х гг. [3, с. 9-10]. Акрамя гэтага, прыходзілася вырашаць і іншыя шматлікія пытанні, звязаныя з арганізацыяй і дзейнасцю нацыянальных школ і іншых культурна-асветніцкіх устаноў.

У значнай ступені цяжкасці па развіцці нацыянальнай адукацыі вызначаліся праблемамі міжваеннага перыяду. Былі, аднак, і іншыя прычыны, якія перашкаджалі разгортваць работу на месцах у галіне нацыянальнай адукацыі. Адна з іх – недакладнасць ва ўліку нацыянальных меншасцей, якія жылі на Беларусі і ў Заходняй вобласці. Асабліва гэта мае дачыненне да латышскага і чэшскага насельніцтва, якое, згодна апошнім перапісам 1926 г., не было поўнасцю выяўлена [3, с. 13].

Побач з нацыянальнымі школамі ў 1920 – першай палове 1930-х гадоў дзейнічалі і латышскія культурна-асветніцкія ўстановы, што забяспечвала рэальныя магчымасці для развіцця латышскага этнасу ў Беларусі, захавання яго культурна-нацыянальных асаблівасцей. З 25 верасня 1931 г. пры Беларускім рэспубліканскім радыёцэнтры пачала трансліравацца радыёперадача на латышскай мове. Рэгулярнае вяшчанне вялося з 1 кастрычніка 12 разоў у месяц па 30 хвілін. Большасць радыёпаведамленняў насіла палітычны характар. Акрамя гэтага ў латышскіх пасяленнях праводзіліся розныя конкурсы, напрыклад, на лепшую вёску і інш. [3, с. 16].

Падагуліўшы вышэй адзначанае, можна сцвярджаць, што латышы за кароткі для гісторыі перыяд пакінулі свой адметны след не толькі ў сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі, але і ў яе грамадска-палітычным і, асабліва, культурным жыцці. Гэта асабліва адчувальна выявілася ў ХХ ст, якое было насычана лёсавызначальнымі падзеямі для ўсіх народаў.

**Літаратура**

1. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд) [і інш ]. – Мінск, 1997. – Т.4. Кадэты – Ляшчэня.

2. Тугай, У.В. Латышскі этнас у сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці Беларусі (XIX – першай палове XX ст) : аўтарэф. … дыс. на атрым. вучон. ступ. доктара гіст. навук / У.В. Тугай. – Мінск : БДПУ імя М. Танка, 2002. – 41 с.

3. Тугай, У. Арганізацыя сістэмы адукацыі і культурна-асветніцкая дзейнасць у латышскіх калоніях БССР і Заходняй вобласці (20-30-я гады) / У. Тугай // Гісторыя: прабл. выкладання. – 2002. – № 2. – С. 3–18.

# ДИСЦИПЛИНА ПО ВЫБОРУ «РОДИТЕЛИ И ДЕТИ В СИСТЕМЕ СЕМЕЙНЫХ ОТНОШЕНИЙ» КАК СРЕДСТВО ФОРМИРОВАНИЯ СЕМЕЙНЫХ ЦЕННОСТЕЙ СТУДЕНТОВ

***Голубев В.Н.***

*УО «Витебский государственный медицинский университет»*

Республика Беларусь, как и многие современные государства, испытывает изменения в рамках института семьи. Эти изменения можно трактовать и как кризис, и как трансформацию. Однако независимо от того, какое наименование дать этому процессу, он обладает множеством негативных характеристик включающих в себя уменьшение числа лиц вступающих в брак, увеличение количества разводов, бездетных семей, внебрачных рождений и т. д. А это свидетельствует об определенной структурной неустойчивости института семьи, потери им ценностных ориентаций. Семья же является социальным институтом, определяющим стабильность общества и способным восполнять население в каждом следующем поколении. Поэтому государство, и общество в целом, заинтересовано в создании условий для обеспечения продуктивного функционирования семьи.

Для реализации задач по укреплению института семьи и возрождению семейных ценностей, заложенных в Концепции национальной безопасности Республики Беларусь и Национальной программе демографической безопасности Республики Беларусь на 2011–2015 гг., на базе УО «ВГМУ» введена дисциплина по выбору «Родители и дети в системе семейных отношений» для студентов V и VI курсов. Для обучащихся, как потенциальных родителей, важным и необходимым является изучение взаимоотношений в семье, её значимости в жизни общества и каждого человека в отдельности.

Целью учебного курса является оптимизация представлений юношей и девушек о детско-родительских отношениях в современных социокультурных условиях. Детско-родительские отношения являются подсистемой семьи. Поэтому изучение дисциплины по выбору начинается с анализа понятия семьи как системы. В современной литературе закрепилось понимание системы как множества элементов, находящихся в отношениях и связях друг с другом, что образует определенную целостность, единство. С позиции системного подхода семья рассматривается как целостная самоорганизующаяся система. Источник преобразования системы лежит внутри ее самой. Поэтому с точки